# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

Дом, у якім утульна ўсім!

berezino2.schools.by



ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно» № 3 (красавік)

*Уладзіслаў ЗАЛАН, вучань 8 "В" класа, у складзе каманды Мінскай вобласці заняў 2 месца на рэспубліканскіх спаборніцтвах "Снежны снайпер», якія праходзілі 4-6 сакавіка на Мінскай лыжа-ролернай трасе.*





*Каманда клуба «ЮІД» нашай школы ў складзе дзесяці чалавек, вучняў 7, 8, 10 класаў, пад кіраўніцтвам педагогаў Зарыны НАВУМАВАЙ і Вікторыі НЕСЦЯРОВІЧ стала пераможцай у намінацыі «Музычны конкурс» і ўладальніцай другога месца па выніках раённага спаборніцтва «КВН ЮІД-2013».*




*Работа вучаніцы 8 «Б» класа нашай установы Кацярыны РОГАВАЙ пад назвай "Што можа зрабіць кожны для эканамічнага дабрабыту сям'і?" была названа лепшай на секцыі "Працоўнае навучанне і чарчэнне" раённай навукова-практычнай канферэнцыі "Навука. Прырода. Чалавек" і адабрана для ўдзелу ў абласным мерапрыемстве. Кіраўнік работы – Галіна Міхайлаўна Губіч.*

(Работы, створаныя Кацярынай, на фота).






# ДАРЭЧЫ СКАЗАНАЕ СЛОВА

**(Калонка Святланы КЛЕШЧАНОК).**

Словы - гэта перададзеныя праз стагоддзі з пакалення ў пакаленне агульныя назвы, сімвалы прадметаў і іх прымет, дзеянняў, працэсаў. Праз вядомыя значэнні слоў, праз узаемадзеянне іх з іншымі асэнсаванымі словамі-назвамі ствараецца пэўная думка. У выніку моўнах зносін яна выклікае ў субяседніка аналагічныя або тыя ж самыя асацыяцыі, вобразнае адлюстраванне рэчаіснасці.

Псіхолагі розных краін адзначаюць, што наша прывабнасць у многім залежыць і ад умення быць цікавым субяседнікам. Гэта ўменне у значнай ступені залежыць ад выхаванасці чалавека і валодання ім асноўнымі якасцямі культуры маўлення: правільнасцю, дакладнасцю, лагічнасцю, чысцінёй, дарэчнасцю, багаццем і выразнасцю.

***Што ж неабходна для захавання асноўных якасцей культуры маўлення?***

Перш за ўсё, разуменне значэння слова, паколькі ўжытае ва неўласцівым яму значэнні слова можа стаць прычынай казуснай сітуацыі. Напрыклад, можна пачуць: "Я люблю наведваць **вернісаж** у літаратурным музеі". У дадзеным прыкладзе няправільна ўжыта слова вернісаж, паколькі яно мае значэнне **'ўрачыстае адкрыццё мастацкай выстаўкі'**, а не выстаўка наогул. Першапачаткова так называлі дзень, калі мастакі пакрывалі лакам карціны перад адкрыццём выставы. Дарэчным было б ужыць у дадзеным выразе слова **выстаўка ('сукупнасць прадметаў, размешчаных дзе-небудзь для агляду, а таксама месца, дзе яны сабраны').** Ці, напрыклад, юнак расказвае: "Мой **дзевер** - справядлівы чалавек, таму я з ім заўсёды раюся па важных пытаннях". **Дзевер - 'мужаў брат'.** Самі разумееце, у якой сітуацыі апынуўся юнак, які не валодаў значэннем сказанага слова.

**(Працяг будзе).**

# ФОТАФАКТ










# ЧАРНОБЫЛЬ - ЧОРНЫ БОЛЬ



*Светлы сімвал Беларусі – бусел. Чорны сімвал Беларусі – Чарнобыль. Падзеям чарнобыльскай трагедыі прысвечана шмат мастацкіх твораў і дакументальных кніг. Але сярод усіх твораў пра Чарнобыль, мусіць, асабліваe месца займае кніга Святланы Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”. Аўтар кнігі неаднаразова пабывала ў чарнобыльскіх раёнах, на свае вочы бачыла пакуты і смерць тысячы нявінных ахвяр мірнага атама. Перад намі гісторыі рэальна існуючых людзей, гісторыі, запісаныя крывёю сэрца. Чытаеш, а над усім гэтым нешта такое паўстае, перад чым душа ледзянее, сэрца заходзіцца ад болю і жалобы… Але ж гэта было, было… І гэта немагчыма забыць!..*

---

**- Я не ведаю, пра што расказаць. Пра смерць ці пра каханне? Ці гэта адно і тое ж… Мы нядаўна пажаніліся. Яшчэ хадзілі па вуліцы і трымаліся за рукі, нават калі ў краму ішлі. Ён засынаў уначы толькі тады, як возьме мяне за руку. У яго была такая звычка – у сне мяне за руку ўсю ноч трымаць. Здавалася, нашаму шчасцю не будзе канца, здавалася, мы ніколі не расстанемся…**

**У тую страшную ноч іх пажарную часць выклікалі на звычайны пажар: нешта гарыць на станцыі. Як былі ў адных сарочках, так і паехалі без спецыяльных касцюмаў, у самае пекла. Тады я яшчэ не ведала, што ён паехаў назаўсёды і не вернецца да мяне… Усю ноч я прачакала яго. Чатыры гадзіны. Пяць, шэсць. А сёмай мне перадалі, што ён у бальніцы ў цяжкім стане. Урачы чамусьці ў адзін голас паўтаралі, што пажарнікі атруціліся газамі. Трэба малако. Шмат малака. “Але ён не п’е малако? – Цяпер будзе піць, каб паправіцца!” І я еду ў бліжэйшую вёску, купляю шмат трохлітровых слоікаў з малаком, каб на ўсіх хапіла. Але ад малака іх страшэнна ванітавала. Ім станавілася ўсё горш. Раніцай, на насілках іх аднеслі ў самалёт, які адправіўся ў Маскву. Уначы сню, што ён мяне кліча… Так кліча… Падымаюся раніцай з цвёрдым намерам ехаць у Маскву. Дарогі не памятаю, усё як у тумане… У Маскве ў першага міліцыянера спытала, у якой бальніцы ляжаць чарнобыльскія пажарнікі, і ён паказаў. Клініка вострай прамянёвай хваробы – 14 дзён. За 14 дзён чалавек паміраe. Урачы папярэдзілі: ты сядзіш ля рэактара. Перад табой ужо не муж, не любы чалавек, а радыеактыўны аб’ект. Цалаваць нельга. Абдымаць нельга. Сядзець побач нельга. Нельга, нельга, нельга… Але як жа так, я яго так кахала?! Заходжу да яго ў палату, на століку ля яго – апельсін. Вялікі, нейкі незвычайны: не жоўты, а ружовы. Усміхаецца: “Мяне пачаставалі. Вазьмі сабе”. А медсястра махае, што нельга гэта есці. Калі ўжо ля яго нейкі час паляжаў, яго не толькі есці – дакранацца да яго страшна. “З’еш, - просіць. – Ты ж любіш апельсіны!” І я бяру апельсін у рукі… Ён у гэты час заплюшчвае вочы, засынае… Кажуць: нельга! А я гатовая ўсё зрабіць, каб толькі ён не думаў аб смерці, аб тым, што хвароба ягоная жахлівая, што я яго баюся…**

**Першы выбух на чацвёртым энергаблоку атамнай станцыі адбыўся 26 красавіка 1986 г. у 1 гадзіну 24 хвіліны. У выніку аварыі адбыўся выкід у навакольнае асяроддзе радыеактыўных рэчываў. Нягледзячы на тое, што станцыя размешчана ва Украіне, каля горада Прыпяць, больш за 70% радыенуклідаў аселі на тэрыторыі Беларусі. Было забруджана больш за 23% тэрыторыі краіны, дзе пражывала 2 мільёны жыхароў, у тым ліку 500 тысяч дзяцей. Не ўсе ведаюць, што чарнобыльская трагедыя закранула практычна кожнага жыхара краіны. Доўга яшчэ трэба будзе даследаваць, які ўплыў аказала выпраменьванне на генетычныя змены, але бясспрэчным з'яўляецца тое, што на Беларусі значна ўзрасла лічба захворванняў на белакроўе і рак шчытападобнай залозы. З'явіліся такія невядомыя да гэтага часу хваробы, як "беларускі букет" – сумесь цукровага дыябету, астмы і алергіі.**

***На Чарнобыльскай АЭС у час аварыі знаходзілася 176 чалавек, але найбольш пацярпелі пажарнікі.***

***Сярод маладых пажарнікаў вылучаўся сваім аптымізмам лейтэнант Віктар Правік. Яму было ўсяго 24 гады. Ён быў вельмі добры і мяккі чалавек, займаўся творчасцю: пісаў вершы і апавяданні, добра маляваў. У вольны ад працы час захапляўся фатаграфіяй. Загінуў у першыя гадзіны аварыі, мужна і самаадданна выконваючы свой абавязак перад радзімай і сваім народам. Загінулі і многія іншыя пажарнікі, а таксама салдаты, бо ратавалі станцыю, Прыпяць, Чарнобыль, сваю сям'ю, ратавалі ўсіх нас. Але не змаглі сябе захаваць, бо атрымалі вялікую дозу радыяцыі.***




Памірала дзяўчынка ў бальніцы,
А дыягназ-прысуд – белакроўе.
Не было на зямлі чараўніцы,
Каб змагла падарыць ёй здароўе.

У бялюткай, як саван, палаце
Высыхала, як кветка, малая.
І бяссільныя бацька і маці:
- Памірае дачка. Памірае!

І самотная гэта палата
Калыхала бяссонныя ночы.
На абходзе ўрач вінавата
Пазіраў у дзіцячыя вочы.

У вачах столькі суму і болі,
Як вады ў глыбокіх азёрах!
Ёй ніколі, ёй болей ніколі
Не гуляць па зялёных прасторах.

Адзвінела духмянае лета,
У пшанічных снапах дагарала.
А дзяўчынка, як кветка з букета,
У бальнічных сцянах памірала.

Белым снегам бялела палата,
І нямелі дзіцячыя мары.
Чалавецтва ўсё вінавата
За атруту чарнобыльскай хмары.

Чорны крыж, чорны след – з Хірасімы
Па зямлі нашай доўжыцца вужам,
Пагражаюць атрутныя зімы
Нашым марам, надзеям і душам.

**Г. Шчур.**








***Вось і настала доўгачаканая вясна. Самы час зняць з сябе ўсю цёплую вопратку і пачаць усіх здзіўляць сваімі ўборамі. Выключыце, нарэшце, інтэрнэт і бегам займацца справамі, бо вакол столькі ўсяго цікавага! А я крыху раскажу, што будзе модным гэтай вясной.***

**Аксесуары.**

Модныя паясы і рамяні. Многія дызайнеры прапануюць рабіць асноўны акцэнт на жаночай таліі. Таму варта аддаць перавагу вопратцы, якая менавіта падкрэсліць стан за кошт фасону. Але таксама акцэнт можна зрабіць і пры дапамозе паясоў.

**Модныя фасоны адзення**

У маючым адбыцца сезоне будуць папулярнымі розныя мадэлі шортаў. Навінка сезона – дзелавыя мадэлі шортаў з адваротам, з ільнянога матэрыялу. Модныя таксама шорты-мікра і шорты з высокай таліяй.

**Колеры вясны**

Вясна-2013 багатая на яркія колеры: ружовы, жоўты, ліловы, аранжавы і зялёны. Трэндам гэтага сезона з'яўляецца спалучэнне яркіх колераў са спакойнымі і незвычайнымі тонамі. Найбольшая перавага аддаецца лёгкім, празрыстым і паветраным матэрыялам. Але папулярнымі будуць і натуральныя матэрыялы, такія як трыкатаж, бавоўна, скура. Яшчэ адзін модны трэнд вясны - верхняе жаночае адзенне з празрыстых і напаўпразрыстых матэрыялаў рознага колеру.





# САКАВІЦКІ АБ'ЕКТЫЎ



У нашай школе ёсць добрая традыцыя – наведанне вучнямі ветэранаў (у святочныя дні, каб павіншаваць, і ў будні, каб дапамагчы па гаспадарцы).

Сёлетняе 8 Сакавіка не стала выключэннем: Лідзія Раманаўна Сухарукава на парозе сваёй хаты сустракала Таццяну Булойчык, Аксану Курапаткіну, Яўгенію Галуза, Надзею Дземеш, Марыю Доўгую, Таццяну Даўгучыц, якія прыйшлі з кветкамі, паштоўкай і шчырымі словамі падзякі за мірнае неба над галавой.












Сакавіцкімі днямі ў нашай школе праходзіла выстава работ удзельнікаў школьнага этапу раённага конкурсу "Вучань года-2013" пад назвай "Адходы ў даходы". Не маглі не здзівіць сваёй арыгінальнасцю створаныя ўласнымі рукамі кампазіцыі, не пакінулі яны раўнадушнымі наведвальнікаў. Падобныя конкурсы дапамагаюць кожнаму школьніку праявіць фантазію, прадэманстраваць уласнае майстэрства.

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно»** 223311, горад Беразіно, вуліца Мультана, 19.
**Эл. пошта: berezinosch2.edu@tut.by**
**Сайт: berezino2.schools.by**
Клуб «Юны журналіст»

**ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА ВУЧНЯЎ І НАСТАЎНІКАЎ!**